


Сланцавыя прасліцы і жаночыя ўпрыгожванні з гарадзішча Лукомль

пласт перыяду Вялікага княства Літоўскага.

Сярод знаходак вырабы з жалеза — сашнікі, сярпы, косы, наканечнікі стрэл, ключы ад замкоў і інш. Знойдзены бранзалеты, розныя жаночыя ўпрыгожванні, зробленыя з каляровых металаў, а таксама вырабы з косці — грабяні, праколкі, накладкі, з каменя — сланцавыя праслiцы (праслiца, праселка, прасельца: грузік — гліняны або каменны з круглай адтулінай у цэнтры, які надзяваўся на верацяно, каб павялічыць інерцыю яго вярчальнага руху), тачыльныя брускі. Былі вырабы са шкла — бранзалеты, каралі. Да рэдкіх знаходак належыць касцяная шахматная фігурка чалавека, касцяная пласцінка з выявамі звяроў, залатая ажурная пацерка. Гарадзішча было месцам старажытнага г. Лукомля.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Нацыянальным музеі Рэспублікі Беларусь.

*Малая Вядрэнь.* За 2 км на ПнУ ад в. Малая Вядрэнь, сярод балот, на паўночным беразе возера і беразе ручая гарадзішча часоў ранняга жалезнага веку (V ст. да н. э. — V ст. н. э.). Мясцовая назва Гарадок, Царкавішча. Пляцоўка авальная, вышынёй 15 — 18 м, памерам 54 × 30 м, шырынёй 1,5 — 2 м. З Пд боку ўваход на гарадзішча шырынёй 1,2 м. У цэнтральнай частцы пляцоўкі захаваліся рэшткі фундамента царквы (памер 22 × 12 м). Захаваліся 2 каменныя кры-